ТАБЕ, ПЕРШАКУРСНІК!

# КЛЮЧ ДА ЗАЛАТЫХ РОССЫПАЎ

Што такое бібліяграфія? Перш чым растлумачыць значэнне гэтага слова, прывядзём некалькі лічбаў. У Савецкім Саюзе штодзённа выходзіць каля 58 тысяч кніг, звыш 3000 часопісаў і іншых перыядычных выданняў, больш 7000 газет. А колькасць кніг, якія выйшлі ў свет з пачатку кнігадрукавання, складае па няпоўных падліках каля 50 мільёнаў назваў.

Як жа разабрацца ў гэтым кніжным моры, як даведацца аб тым, дзе сярод гэтых дзесяткаў мільёнаў выданняў тоіцца тое, што сапраўды патрэбна аднаму чытачу? Як з многага выбраць лепшае? Як атрымаць патрэбную кнігу?

«Сучасны чалавек, — піса ў акадэмік С. І. Вавілаў, — знаходзіцца перад гімалаямі бібліятэк у становішчы шукальніка золата, якому патрэбна знайсці крупінку золата ў масе пяску».

Адшукаць гэтыя «залатыя крупінкі» чытачу дапамагае бібліяграфія. Бібліяграфія—гэта даведнікі і ўказальнікі літаратуры, спецыяльныя бібліяграфічныя часопісы, рэкамендацыйныя спісы і крытычныя агляды літаратуры, праграмы, планы і «колы» чытання, памяткі чытачу і г. д.

Усе віды бібліяграфіі дапамогуць чытачу даведацца, якая літаратура існуе па таму або іншаму пытанню, у якія гады яна выдана, на якой мове, хто аўтары кніг і часопісаў. Яна раскрывае перад чытачамі кніжныя багацці па ўсіх галінах ведаў.

У нашай краіне існуе бібліяграфічны цэнтр—Усесаюзная кніжная палата, якая атрымлівае ўсе друкаваныя выданні Савецкага Саюза: кнігі, часопісы, газеты, ноты, карты, плакаты, лістоўкі. На аснове атрымліваемых абавязковых экземпляраў ажыццяўляецца інфармацыя аб новых паступленнях. «Кніжны летапіс» інфармуе аб выхадзе новых кніг з друку; «Летапіс часопісных артыкулаў» і «Летапіс газетных артыкулаў» — аб новых часопісных і газетных артыкулах; «Летапіс рэцэнзій» — аб рэцэнзіях на кнігі. Выдаецца таксама «Летапіс музычнай літаратуры» і «Летапіс выяўленчага мастацтва». У нас у рэспубліцы кніжная палата БССР выдае «Летапіс друку БССР», які рэгіструе ўсе кнігі, часопісныя і газетныя артыкулы, што выдаюцца ў Беларусі на беларускай і рускай мовах, а ў спецыяльным аддзеле «БССР у друку СССР»—усё, што друкуецца аб Беларусі.

Выкарыстоўваючы летапіс чытач можа рэгулярна сачыць за ўсёй выходзячай літаратурай і падбіраць усё, што яму патрэбна для вучобы і самаадукацыі.

Бібліяграфія патрэбна не толькі затым, каб сачыць за навінкамі літаратуры. Каб знайсці выказванні класікаў марксізма-ленінізма па любому пытанню або аб якой-небудзь асобе, трэба ведаць, які існуе даведачны апарат да іх твораў і як ім карыстацца. Трэба памятаць аб тым, што існуе алфавітны ўказальнік да першага выдання твораў К. Маркса і Ф. Энгельса, па якому можна адшукаць, у якім томе надрукаваны той або іншы іх твор, у якім годзе і хто з'яўляецца аўтарам гэтага твора (Маркс і Энгельс, Энгельс ці Маркс). Каб адшукаць цытату з твораў К. Маркса і Ф. Энгельса, трэба выкарыстаць прадметны ўказальнік да іх «Збору твораў», «Збору пісем» і да асобных буйных твораў, як «Капітал» К. Маркса; «Анты-Дзюрынг» Ф. Энгельса і да іншых.

Вялікі даведачны апарат ёсць да «Твораў» У. І. Леніна: прадметны ўказальнік, алфавітны ўказальнік твораў, імянны ўказальнік, які дае магчымасць знайсці выказванні У. І. Леніна аб розных вядомых асобах; указальнік геаграфічных назваў, па-якому, напрыклад, можна падабраць выказванні У. І. Леніна аб Беларусі, Мінску і г. д; указальнік твораў мастацкай літаратуры і крытыкі, пагаворак, прымавак і крылатых слоў, выкарыстаных або ўпамянутых У. І. Леніным.

Побач з невялікімі ўказальнікамі, якія маюць рэкамендацыйны характар і не вычэрпваюць усёй літаратуры па данай тэматыцы, ёсць указальнікі, якія ўтрымліваюць усю літаратуру па данай галіне ведаў. Можна прывесці для прыкладу некалькі з іх: «Гісторыя СССР. Указальнік савецкай літаратуры 1917—1952 гадоў па гісторыі СССР», указальнік М. Мацуева па савецкай мастацкай літаратуры і крытыцы за 1938—1957 гады. Аналагічныя ўказальнікі ёсць па хіміі, фізіцы і цэламу раду іншых пытанняў. Акрамя таго ёсць цэлы рад указальнікаў, прысвечаных асобным пісьменнікам і вучоным.

Выкарыстоўваючы летапісы, даведнікі рознага характару (энцыклапедыі і слоўнікі), бібліяграфічныя ўказальнікі, каталагі і картатэкі можна знайсці неабходныя кнігі па любому пытанню.

Дзяжурны бібліёграф заўсёды акажа дапамогу ў падборы літаратуры, навучыць, як карыстацца летапісамі, каталагамі і картатэкамі, падкажа, дзе знайсці патрэбны матэрыял.

**З. РАХМАНЧЫК,**
**старшы бібліёграф.**

## Шчырае дзякуй!

У верасні да нас у калгас на дапамогу прыехалі студэнты. 10 чалавек сталі працаваць у свірне. Імі аказаліся студэнты другога і трэцяга курсаў аддзялення беларускай мовы і літаратуры БДУ імя У. І. Леніна.

Хлопцы адразу ўключыліся ў калгаснае жыццё. Не сакрэт, у свірне работа нялёгкая. Яна і пыльная, і працаёмкая. Але, нягледзячы на гэта, кожны дзень рабяты выконвалі па 1,5—2 нормы. За ўвесь час працы ў свірне, а працавалі яны амаль месяц, на долю кожнага прыйшлося больш, чым па 200 тон грузу. З агенькам працавалі і студэнты другога курса Павел Буры, Уладзімір Марцэль, Юры Міцкевіч і трэцякурснікі Вечаслаў Рагойша, Іван Сінаўка, Аляксандр Пархімчык. Асабліва трэба адзначыць старанасць Паўла Бурага. Ён працаваў увесь час на самых цяжкіх участках работы.

Былі, нажаль, і такія, якія пабаяліся цяжкасцей. Студэнты другога курса Іскрык і Паўлюкоўскі невядома па якіх прычынах з'ехалі дамоў, нават не папярэдзіўшы мяне аб гэтым. Але такіх аказалася толькі двое.

У заключэнне хочацца ад душы сказаць: шчырае дзякуй вам, рабяты, за ўсё тое, чым дапамаглі вы нашаму калгасу.

**М. ПАШКЕВІЧ,**
**кладаўшчык кладавой № 1 калгаса «Іскра» Дзяржынскага раёна.**

## Словы на развітанне

Ёсць нявыказаная радасць у сумнай, развітальнай красе восені. І яна асабліва адчуваецца тады, калі ўсведамляеш, што ты ішоў у нагу з часам і навёрстваць табе нічога не патрэбна.

26 рабочых дзён... Імгненна праляцелі яны для студэнтаў другога курса аддзялення журналістыкі. За гэты час яны дапамаглі калгаснікам засціртаваць салому, звезці і разаслаць лён, адсартаваць збажыну. Другакурснікі засіласавалі ўсю кукурузу і салодкі лубін у калгасе «Кастрычніцкая рэвалюцыя» Дзяржынскага раёна. Яны выпусцілі 2 нумары насценгазеты.

Усе студэнты групы працавалі ад душы, не шкадуючы сіл.

Таму нікольні не дзіўна, што Антон Іосіфавіч Кулікоўскі, старшыня калгаса, паціснуўшы ўсім рукі, на развітанне сказаў:

— Малайцы, рабяты! Ад імя ўсіх калгаснікаў выношу вам падзяку за ўзорную працу. Будзьце і ў вучобе такімі ж!

**Т. ХАРАВЕЦ.**

# ДАНІЛА ШЫЛА Ў ГАСЦЯХ,

## або маналог студэнта, які жыве ў інтэрнаце па вуліцы Дзімітрава

— Заходзь калі ласка, братка Даніла, зараз мы з табой пасядзім, пагутарым аб тым-сім... Толькі не здзіўляйся гэткаму выгляду пакоя. Гэта не навагодняя гірлянды мы вешаць збіраемся, а ўсяго толькі вяроўкі, на якіх мы кашулі сушым. Вось высушым, тут жа і прасаваць будзем. Пытаешся, чаму? А таму, што няма ў нас такога памяшкання, дзе можна было б памыць бялізну, усё ва ўмывальніках рабілі. Раней яшчэ горш было: ткнеш у разетку шнур, а току няма. Хоць плач. Даводзілася штаны паміж матрасамі класці, каб «стрэлкі» навесці... А паспрабуй дачакацца гарачай вады! Днём цітан не грэюць, а ўвечары на ўсіх гатаванай вады не хапае. Хацелі былі мы дзённае дзяжурства ля цітана ўстанавіць, ды дзе там, нас і блізка не падпусцілі, маўляў, паламаеце яшчэ... Выбачай, братка Даніла, забыў я цябе пачаставаць. Ах, ты ўжо паабедаў? Ну, дзякуй богу, а то ў нас у інтэрнаце ні сталовай, ні буфета няма, бегаем аж да плошчы Свабоды ці нават у праспект у магазін. Думаеш, няма у нас памяшкання для сталовай? Ёсць памяшканне, нават абсталяванне ёсць, толькі штосьці яго ніяк не ўстановяць... А калі не галодны, давай тады браток, газеты пачытаем, а то ў нас у чырвоным кутку ні радыёлы, ні тэлевізара няма. Прабач, ёсць і тое. і другое. Але радыёле ўжо гадоў пад дзесяць, і яна гадзіну іграе, а месяц стаіць. Тэлевізар таксама ўжо даўно сапсаваны, а адрамантаваць яго ўсё нііхто не addae...

Ну, што табе яшчэ паведаміць? Хочаш, Даніла, я раскажу аб нашых хлопцах, якія на пятым курсе хімфака вучацца? Гэта—Мікола Шэдаў, Уладзімір Ляўданскі, Валеры Казакевіч, Уладзімір Кулікаў. Яны жывуць у 281 пакоі. Зайшоў я аднойчы да іх і ледзь зразумеў, куды я трапіў. Не буду апісваць той бруд, той беспарадак, які панаваў там. Самае цікавае ў тым, што старастай яны абралі пятага жыхара пакоя—другакурсніка Міколу Фурсевіча. Ён працаваў у калгасе, а пяцікурснікі, бедакі, без старасты, што без рук, не ведаюць нават, хто дзяжурыць павінен. Таму і атрымалася, што ў пакоі так брудна.

Дарэчы, іх, пяцікурснікаў, ужо абагналі першакурснікі з хімфака. Зазірнуў я ў 140 пакой, дзе старастай Віктар Субач, дык аж сляза прабіла—такі моцны пах тытуню і гуталіну шыбануў мне ў нос. На стале—прыкладна тая ж «чысціня», што і на падлозе. Ложкі не разабраныя, на іх—хто ў адзенні, хто нават у абутку, ляжаць жыхары пакоя. Гэта яны адпачываюць так. Хацеў я аб усім у насценную газету напісаць, нават напісаў. Пайшоў шукаць яе, так і не знайшоў. Дарэмна толькі пісаў, час губляў...

Ты ўжо збіраешся ўходзіць, братка Даніла? Сядзі, усё роўна з пакоя не выйдзеш. У дзвярах такія замкі парабілі, што калі ручкі адламаюцца (не думай, што гэта мы сілу спрабуем, будаўнікі проста такімі недатыкальнымі іх парабілі), то ўжо з пакоя не выбярэшся, пакуль хто-небудзь з нашых не прыдзе і звонку не адчыніць. Сядзелі ж так аднойчы хлопцы ў кубавой цэлую ноч...

Маналог падслухаў і запісаў
**Яўген ЛЯХАЎ**

## ШАХМАТЫ

**Я. Ляхаў**

**ЗАДАЧА-МІНІЯЦЮРА**



Белыя: Крe8, Лg8, Сc5, п. а7 (4).
Чорныя: Крс7 (1).

**Белыя пачынаюць і даюць мат у тры хады.**

РАШЭННЕ

задачы, змешчанай у нумары ад 1 кастрычніка.

1. Кс2—а3 Крс6—с5
2. Фb8—d6×.

# Узмацніць ролю мастацкай самадзейнасці

У рашэнні задач выхавання будаўніка камуністычнага грамадства цяжка пераацаніць значэнне самадзейнага мастацтва.

Між тым, у арганізацыі самадзейнасці сярод студэнтаў і навуковых работнікаў універсітэта дапускаюцца сур'ёзныя недахопы і ўпушчэнні. Звяртае па сябе ўвагу тое, што мастацкая самадзейнасць, як правіла, не мела практычнага значэння. Работа калектываў на радзе факультэтаў насіла фармальна-паказны характар. Асноўная мэта мастацкай самадзейнасці зводзілася да таго, каб раз у год «дастойна», як звычайна гаварылі ўдзельнікам мастацкай самадзейнасці, абараніць гонар факультэта на універсітэцкім аглядзе самадзейных калектываў.

Некаторыя, няўмеру заўзятыя актывісты карысталіся пры гэтым несумленнымі прыёмамі—прыцягненнем падстаўных асоб, паўтарэннем з году ў год адных і тых жа канцэртных праграм і г. д. Карацей, сістэматычнай работы ў гэтых калектывах, карыснай і патрэбнай як для саміх удзельнікаў, так і для грамадскасці, як правіла, не вялося. Перад аглядам яны за тыдзень—два штурмам «аваладвалі» ўсімі тонкасцямі мастацтва. Самі па сабе такія агляды самадзейнасці насілі больш парадны характар і патрэбнай мэты не дасягалі.

Падводзячы вынікі мастацкай самадзейнасці мінулага года і аналізуючы выяўленыя пры гэтым недахопы, рэктар універсітэта па прадстаўленню парткома выдаў загад, якім пацвердзіў, у прыватнасці, упершыню распрацаванае «ПАЛАЖЭННЕ-ПРАГРАМУ» круглагадовага агляду калектываў мастацкай самадзейнасці факультэтаў. Яна прадугледжвае:

**I. Мэты і задачы агляду-конкурса**

1. Шляхам арганізацыі разнабаковай культурна-масавай работы садзейнічаць усебаковай адукацыі і камуністычнаму выхаванню студэнцкай моладзі.

2. Сістэматычнай і планамернай работай студэнтаў і супрацоўнікаў універсітэта ў гуртках мастацкай самадзейнасці садзейнічаць развіццю і пашырэнню эстэтычных густаў і схільнасцей.

3. Выяўляць і яшчэ больш удасканальваць творчыя здольнасці студэнцкай моладзі для папаўнення агульнауніверсітэцкіх калектываў мастацкай самадзейнасці.

4. Абслугоўваць канцэртна-выканаўчай дзейнасцю палітыка-выхаваўчыя і культурна-масавыя мерапрыемствы на факультэтах, у падшэфных арганізацыях і сярод насельніцтва Беларускай ССР.

**II. Кіраўніцтва.**

1. Агульнае кіраўніцтва арганізацыяй і праведзеннем агляду-конкурсу мастацкай самадзейнасці на працягу навучальнага года ажыццяўляецца мастацкім Саветам пры садзеянні грамадскіх арганізацый і перш за ўсё праўлення клуба універсітэта.

2. Адказнасць за ўкамплектаванне калектываў мастацкай самадзейнасці і падбор іх кіраўнікоў нясуць, згодна загаду рэктара, дэканаты, партыйныя і грамадскія арганізацыі факультэтаў.

3. Улік і кантроль за канцэртна-выхаваўчай дзейнасцю факультэцкіх калектываў як паза-, так і на факультэтах на працягу ўсяго года ажыццяўляецца камітэтам камсамола па адпаведных пуцёўках.

**III. Праграма агляду-конкурса і яго патрабаванні:**

Круглагадавы агляд-конкурс на лепшую пастаноўку мастацкай самадзейнасці ў 1960/61 навучальным годзе праводзіцца спачатку асобна па жанрах. У канцы года праводзіцца заключны канцэрт па ўсіх жанрах, падводзячы вынік усёй работы ўсіх калектываў.

Агульнауніверсітэцкія агляды-конкурсы праводзяцца па наступных жанрах:

1. Мастацкае чытанне і драмкалектывы—з 1 па 7 снежня.

2. Вакальны жанр: сола і хоры—з 7 па 10 снежня.

3. Танцы і мастацкая гімнастыка—з 10 па 12 снежня.

4. Музыка—з 12 па 15 снежня.

Заключны канцэрт па агульнай праграме агляду, выконваемы лепшымі калектывамі ўсіх факультэтаў, праводзіцца напярэдадні агульнагарадскога агляду мастацкай самадзейнасці вышэйшых навучальных устаноў з тым разлікам, каб яго пераможцы маглі быць рэкамендаваны на гарадскі агляд для ўдзелу ў ім разам з агульнауніверсітэцкім калектывам.

Пры вызначэнні пераможцаў агляду-конкурса журы будзе прад'яўляць наступныя патрабаванні да яго ўдзельнікаў:

1. Якасць выканання і колькасць нумараў, прадстаўляемых журы на заключны канцэрт.

2. Масавасць (колькасць удзельнікаў факультэцкіх і універсітэцкіх калектываў) вызначаецца адпаведна з агульнай колькасцю студэнтаў на факультэце.

3. Ідэйны змест выконваемых нумароў. Заахвочваецца адлюстраванне ў прадстаўляемым рэпертуары агульнауніверсітэцкага жыцця.

4. Разнастайнасць жанраў самадзейнага мастацтва.

5. Канцэртна-выканаўчая дзейнасць, якая ўлічваецца па адпаведных пуцёўках камітэта камсамола на працягу года.

**IV. Удзельнікі агляду-конкурса і яго адзнака**

Удзел у аглядзе могуць прыняць як студэнты, так і работнікі універсітэта ў складах калектываў або індывідуальна. Кожны ўдзельнік агляду ў складзе калектыву адзначаецца **адным балам.** Саліст і ўдзельнік універсітэцкіх калектываў, які выступае за факультэт, — **двума баламі,** кіраўнік факультэцкага калектыву з ліку ўдзельнікаў універсітэцкіх калектываў і работнікаў універсітэта— **трыма баламі.**

Удзел у мастацкай самадзейнасці як універсітэцкай, так і факультэцкай лічыцца як выкананне грамадскіх даручэнняў.

**V. Прэміяванне**

1. Факультэту-пераможцу агляду-конкурса прысуджаецца **Пераходны чырвоны сцяг і грамата.**

2. Факультэт, які заняў другое месца, узнагароджваецца **пераходным прызам і граматай.**

3. Факультэт, які заняў трэцяе месца, узнагароджваецца **граматай рэктарата.**

4. Пераможцам па асобных жанрах прысвойваецца званне **«Лаўрэата агляду-конкурса»** і ўручаецца **грамата і падарунак.**

5. Лепшыя арганізатары на факультэтах узнагароджваюцца граматамі.

**РЭКТАРАТ, ПАРТКОМ, КАМІТЭТ ЛКСМБ, ПРАФКОМ.**

Адрас рэдакцыі: Мінск, Універсітэцкі гарадок, біякорпус, 31; тэл. 2-07-19. Рэдактар М. ЦІКОЦКІ.

АТ 00460. Зак. 1759. Друкарня выдавецтва БДУ імя У. І. Леніна. Тыраж 2000.